

Я Ў ШКОЛЕ – НА СВАІМ МЕСЦЫ

ЧЫРВОНКА

НА ТЭЛЕБАЧАННІ ВАЖНА ЗАСТАВАЦЦА САБОЙ

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 ЛІСТАПАДА 2023 г. ЧАЦВЕР № 227 (30107)


## КОРАТКА

- Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў 2025 годзе плануюць правесці ў Ніжнім Ноўгарадзе.
- У Гродзенскай вобласці за дзесяць месяцаў пабудавалі амаль 60 тыс. кв. м жылля з электраацяпленнем.
- Забароны выхаду на лёд увялі ў 17 раёнах Віцебскай вобласці.
- Фільмы аб нацыянальных парках «Прыпяцкі» і «Белавежская пушча» планукоць зняць на «Беларусьфільме».
- Мабільны каток каля Палаца спорту ў Мінску адкрыў сезон.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «І ЭКАНОМІКА, І ПАЛІТЫКА, І ГУМАНІТАРНАЯ СФЕРА Ў НАС З ТАДЖЫКІСТАНАМ РАЗВІВАЮЦЦА НЯДРЭННА»

### Сустрэча лідараў дзвюх краін прайшла ў Палацы Незалежнасці

**Адным з першых на сесію Савета калектыўнай бяспекі ў Мінск прыляцеў Прэзідэнт Таджыкістана. Першае мерапрыемства ў графіку Эмамалі Рахмона — сустрэча з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам.**

«Сустракаю вас як сябра. Вы вельмі блізкі беларускаму народу. Вас вельмі добра ведаюць і не толькі таму, што мы з вамі, ужо можна сказаць, доўгажыхары. Вас паважаюць за вашу адкрытасць, прастату, душэўнасць, як і ўвесь таджыкскі народ», — прывітаў госця Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што сёння ва ўсіх дзяржаў няпростая абстаноўка. «У вас заўсёды яна была няпростая, вас там з поўдня падаграваюць увесь час. Ведаю, што няпроста, але я заўсёды дзіўлюся таму, як вам удаецца ў гэтай сітуацыі трымаць эканоміку», — сказаў беларускі лідар. Ён прызнаўся, што вельмі рады поспехам Таджыкістана ў электраэнергетыцы. Па яго словах, продаж вялікай колькасці электраэнергіі будзе добрым прыбыткам працавітаму таджыкскаму народу.

СТАР. 2



Фота БелТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Прынцып сацыяльнай адказнасці рэалізаваны ў многіх заканадаўчых актах, пачынаючы з Працоўнага кодэкса, заканчваючы лакальнымі нарматыўнымі дакументамі прадпрыемстваў па рэалізацыі канкрэтных сацыяльных праектаў. Гэты падыход пачаў увасабляцца ў жыццё з прыходам да ўлады Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, які дакладна абазначыў задачы для бізнесу. Так, кожнае буйное і прыбытковае прадпрыемства краіны павінна ўносіць свой уклад у развіццё грамадства і рэалізоўваць сацыяльныя праекты. Сёння на кожным буйным дзяржаўным і многіх прыватных прадпрыемствах такі прынцып дзейнічае».*

# Доктар спяшаецца на выклік




Дар'я МАРСКАЯ — малады спецыяліст. Яна ўзначаліла Брадзецкую сельскую амбулаторыю Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці ў мінулым месяцы. Участак адказны — усяго на абслугоўванні амбулаторыі знаходзяцца 1032 чалавекі. Прыйшла малады ўрач агульнай практыкі на добраўпарадкаванае працоўнае месца — летась у амбулаторыі зрабілі капітальны рамонт, было абноўлена абсталяванне, з'явілася гарачае водазабеспячэнне. У падпарадкаванні амбулаторыі — два сельскія ФАПы, дзе вядзецца фельчарскі прыём. Па традыцыі ў першай палове дня ўрач праводзіць прыём першасных і планавых пацыентаў, а пасля абеду едзе на выклікі.

Фота БелТА.

Эканамікс

# ЭКСПАРТ ПРАЛЬНЫХ МАШЫН ВЫРАС У ЧАТЫРЫ РАЗЫ

### Пётр ПАРХОМЧЫК — аб бягучым стане прамысловага комплексу краіны і перспектывах развіцця

**Нягледзячы на ўведзеныя супраць Беларусі санкцыі, айчынная прамысловасць дэманструе станоўчыя вынікі і стабільнае функцыянаванне. Гэта асноўны лейтматыў даклада «Аб забеспячэнні ўстойлівай работы прамысловага комплексу ў 2023 годзе і ходзе рэалізацыі імпартазамяшчальных праектаў» намесніка прэм'ер-міністра, які выступіў падчас сумеснага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, а таксама адказаў на пытанні парламентарыяў.**

СТАР. 4



ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

